мала таго, што нашы гімназіі ператрывалі нанесеныя ім удары. Справа йдзе аб тое, каб надалей зрабіць немагчымым правацырваньне з таго ці іншага боку шчырае, ідэйна настроенае, даверчывае школьнае моладзі. І тут ужо пачынаецца абавязак усяго грамадзянства, перадусім — бацькоў.

Да грамадзянства, да бацькоў мы сяньня й зварачаемся з заклікам: *беражыце нашых дзяцей!* Не давайце, каб зь іх рабілі „гарматнае мяса“ — нібыта ў імя „сусьветнае рэвалюцыі“. Сусьветная рэвалюцыя, абвяшчаючы *вызваленьне прыгнечаных народаў,* ня можа пачынаць свайго паходу наперад *нішчэньнем* гэтых жа народаў. І ў тэй барацьбе, якую распачаў зь беларускім вызвольна–адраджэнскім рухам „чырвоны“ маскоўскі нацыяналізм, крыецца ўнутраная ілжа, крыецца глыбокая супярэчнасьць з высокімі лёзунгамі, якімі ён прыкрывае сваё зьвярынае аблічча.

Зразумейце ж гэта ўсе грамадзяне, усе бацькі! Зразумейце, што ня дзеля „актыўных выступленьняў“ дзяцей з такім вялізным трудом тварыліся нашы гімназіі, а дзеля таго, каб даць гэтым дзецям навуку, прыгатаваць іх да вялікага заданьня, якое прыпадае на іх долю як будучых інтэлігентаў. *І дайце належны адпор усім, хто хоча нашы працоўныя масы пакінуць бязраднымі і безабароннымі, пазбавіўшы іх сваей роднай інтэлігенцыі.*

## У імя чалавечнасьці

Нядаўна мы падалі нашым чытачом вестку аб тым, што на паседжаньні Беларускага дабрадзейнага таварыства 27 сьнежня — згодна з прапазыцыяй грам. Астроўскага — было пастаноўлена ўтварыць *патранат* дзеля матэрыяльнае і маральнае апекі над асобамі, пазбаўленымі магчымасьці зарабляць на хлеб сваей працай, а такжа над іх сем'ямі. Новавыбранаму ўраду Таварыства даручана было заняцца распрацоўкай і арганізацыяй патранату.

Горача вітаючы распачатую Таварыствам акцыю, мы лічым сваім абавязкам зьвярнуць сяньня ўвагу ўсяго нашага грамадзянства на цэлую чысьленую групу людзей, якія ў першую чаргу мусяць быць абняты патранатам. Гэта — тыя, хто аказаўся супраць волі адарваным ад варштату сваей працы, ад сваей сям'і і апынуўся *ў астрожных мурох...*

Ад найдаўнейшых часоў ува ўсіх грамадзянствах маральнае і матэрыяльнае падтрыманьне вязьняў лічылася аднэй з найвыдатнейшых цнотаў чалавека. Вельмі высака стаўляў яе і Хрыстос. Але калі да людзей, ужо засуджаных за той ці іншы праступак, быў шырака стасаваны гэты акт міласэрнасьці — у імя пачуцьця гуманнасьці, чалавечнасьці, дык наколькі ж балей павінна рупіцца грамадзянства аб людзёх, папаўшых у астрог толькі дзеля западозраньня іх у нейкім дзеяньні, маючым адзнакі праступку часта адно толькі з пункту гледжаньня інтарэсаў тэй ці іншай пануючай партыі! Мы маем тутака на думцы вялізарную лічбу так званых прэвэнцыйных вязьняў, каторыя часамі сядзяць гадамі за астрожнымі кратамі, а пасьля звальняюцца судом ад усялякае кары як зусім непавінныя ў узьведзеных на іх абвіненьнях. Найчасьцей гэтак бывае ў нас у справах палітычных: нядаўна мы мелі ў Віленскім акружным судзе ажно дзьве палітычныя расправы, на якіх судзілі каля 60 беларускіх сялян з ваколіц Глыбокага, і ўсе яны, праседзеўшы многа месяцаў на Лукішках, былі апраўданы — апрача двайга ці трайга. І вось дзеля таго, што гэтыя несправядліва пасаджаныя на лаву падсудных людзі не належалі да ніякае палітычнае партыі, аб іх абсалютна ніхто й не паклапаціўся, ніхто не дапамагаў ані ім, ані іхным сем'ям, пазбаўленым сваіх карміцеляў.

Хто хоць раз пабываў у „гасьцінных“ сьценах Лукішак — гэтага „нацыянальнага палацу“ беларусаў, той ведае, што і вялізарная лічба вязьняў, так ці сяк папраўдзе зьвязаных з палітычнымі партыямі, у працягу свайго пабыту ў астрозе ня маюць ад гэных партыяў ніякага падтрыманьня. Партыі разважаюць вельмі проста: раз ты ўжо „прасыпаўся“, дык перастанеш быць карысным для партыі, і рупіцца аб табе няма патрэбы!

Так — хоць яно й агідна! — могуць разглядаць пытаньне аб дапамозе вязьням палітычныя партыі, але грамадзянства глядзець так ня можа. Кожны вязень для грамадзянства — гэта перадусім чалавек, якога сустрэла няшчасьце, няшчасьце, зьвязанае найчасьцей з палітычнымі яго перакананьнямі. І гэткім нешчасьлівым людзём і іхнім сем'ям, якія мо шмат балей церпяць „на волі", чым іх карміцель — у астрозе, грамадзянства мусіць дапамагаць — *у імя чалавечнасьці.*

Праўда, існуюць у Польшчы так званыя астрожныя патранаты, на чале якіх стаяць звычайна пракуроры. Але гэтыя ўстановы паўафіцыяльнага характару выяўляюць вельмі абмежаваную дзеяльнасьць і нияк не карыстаюцца спогадам шырэйшага грамадзянства. Шырокая ініцыятыва Беларускага дабрадзейнага таварыства як установы наскрозь грамадзкай мусіць выклікаць спогад у нашых працоўных масах вёскі і места, мусіць пабудзіць *усё нашае грамадзянства* да ўчасьця ў зборцы грошаў ці прадуктаў для вязьняў і іх абяздоленых сем'яў.

Не ў імя палітыкі, не ў імя партыйнасьці, а выключна *ў імя чалавечнасьці.*

## Цень Азэфа

Ад самага пачатку будаваньня новага ладу ў СССР тварцы сацыяльнае рэвалюцыі спыніліся перад двума в.[1] труднымі пытаньнямі, „абыйсьці" ці „пераступіць" праз якія аказалася немагчымым. Гэтыя пытаньні — нацыянальнае і сялянскае. Але бясспрэчна геніяльны грамадзкі будаўнік Ленін знайшоў формулу дзеля іх вырашэньня. Пасьля першапачатковага разгону ў кірунку падганяньня ўсіх нацыянальнасьцяў пад „маскоўскі ранжыр", пасьля заявы ў нас, у Вільні, тав. Іофе ў 1919 годзе, што „все вы — белорусы і литовцы — будете хорошими русскими"[2], Ленін рашуча зьмяніў курс савецкае нацыянальнае палітыкі ў кірунку *падтрыманьня культурна–нацыянальнае творчасьці паасобных народаў і тварэньня нацыянальных рэспублік* — у складзе СССР. А ў адносінах да сялянства — ізноў жа пасьля жорсткіх, часта крывавых экспэрымэнтаў з забіраньнем сялянскага хлеба і ўсякага дабра дзеля пракорму места, па думцы таго ж Леніна, падзяліўшага дворныя землі між сялянамі, распачата была палітыка *дапамогі ў разьвіваньні і рацыяналізацыі дробных хутарскіх гаспадарак,* якія ў Усходняй Беларусі — у працягу першага дзесяцігодзьдзя савецкай улады — так буйна расьцьвілі. Праўда, аднача́сна тварыліся і калектыўныя сельскія гаспадаркі, але — безь ніякае прынукі, дый пад „калгасы" ў Усх. Беларусі адышло ўсяго некалькі працэнтаў (здаецца, толькі 3%) здатнае пад гаспадарку зямлі.

Такая палітыка і з паасобных нацыянальнасьцяў, і з стомільённае сялянскае масы СССР зрабілі шчырых прыхільнікаў новага ладу. Унутраная грамадзкая барацьба ў СССР, падтрымліваная вельмі энэргічна вонкавымі сіламі і вонкавымі грашмі, значна сьцішэла, утраціла сваю ранейшую вострасьць[3]. І здавалася, што той залаты мост, які пабудаваў Ленін паміж сялянствам і мястовым пралетарыятам, паміж паасобнымі нацыянальнасьцямі і Масквой, дае шырокія магчымасьці для савецкага будаўніцтва ў атмасфэры гарманічнага супрацоўніцтва дзьвёх асноўных галінаў працоўнага народу: сялянства і работнікаў — бяз розьніцы нацыянальнасьці.

Але вось у кіраўнічых сфэрах СССР — пасьля сьмерці Леніна — пачынаюцца адбывацца нейкія дзіўныя праявы. Адзін за адным усе старыя супрацоўнікі Леніна абвяшчаюцца... „контррэвалюцыянэрамі", „адступнікамі", „здраднікамі" Рэвалюцыі і працоўных масаў. Такі лёс спатыкае перадусім *Троцкага* і цэлую групу яго супрацоўнікаў — найбольш выдатных савецкіх дзеячоў[4]. Далей — *Луначарскага* і *Бухарына,* найвыдатнейшых тэарэтыкаў „ленінізму"[5]. І ў рэзультаце на чале ўсяго дзяржаўнага жыцьця СССР бачым аднаго–адзінага *Сталіна* як бясспрэчнага *дыктатара, „чырвонага Мусаліні".*